**УДК [338.48-6:908+008:001.89:005.71](476)(091)"192"** **DOI 10.52928/2070-1608-2023-66-1-65-69**

# СТАНАЎЛЕННЕ ЭКСКУРСІЙНА-ТУРЫСТЫЧНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ Ў 1920-я гг. У СВЯТЛЕ КРАЯЗНАЎЧЫХ ІНІЦЫЯТЫЎ ІНБЕЛКУЛЬТА

***С.М. ГРЫШКЕВІЧ***
***(Інстытут гісторыі Акадэміі навук Беларусі, Мінск)***

*У дадзеным артыкуле разглядаюцца краязнаўчыя ініцыятывы Інстытута беларускай культуры ў кантэксце іх далейшага ўплыву на развіццё турыстычна-экскурсійнай дзейнасці. У 1920-я гг. ішоў працэс збору і сістэматызацыі краязнаўчых ведаў. Станаўленне турыстычнай дзейнасці ў БССР пачыналася з развіцця краязнаўства, якое ў БССР кіравалася ЦБК пры Інбелкульце. Галоўным сродкам сувязі кіраўніцтва ЦБК з аматарамі краязнаўства на месцах з'яўляўся часопіс «Наш край», які адлюстроўваў галоўныя тэндэнцыі і дасягненні ў вывучэнні краязнаўства на той момант. Першапачаткова асаблівая ўвага надавалася вывучэнню і захаванню архітэктурнай і гістарычнай спадчыны, але ўжо з 1926 г. назіралася пераарыентацыя краязнаўтва на "сацыяльна-карысныя" тэмы. Краязнаўчыя ініцыятывы. На падмурку сабраных краязнаўцамі ведаў у далейшым будаваліся экскурсійныя маршруты.*

***Ключавыя словы:*** *Інбелкульт, краязнаўства, турызм, Наш край, БССР, Цэнтральнае Бюро Краязнаўства, ахова помнікаў.*

**Уводзіны.** Пры вывучэнні турыстычна-экскурсійнай дзейнасці у 1920-я гг. неабходна акцэнтаваць увагу на краязнаўстве, бо менавіта яно было фундаментам турыстычна-экскурсійнай дзейнасці. У 1920-я гг. турыстычная дзейнасць не існавала ў сучасным разуменні гэтага слова, як тураператарская і турагентская [1], паколькі для яе рэалізацыі ў такім выглядзе не хапала ні дастатковай інфармацыі, ні матэрыяльна-тэхнічнай базы. Шматлікія турыстычныя аб'екты былі наўпрост незафіксаванымі, мелася слабое ўяўленне аб існаванні некаторых архітэктурных, прыродных аб'ектаў. Па гэтай прычыне ў маладой БССР вялікая ўвага надавалася назапашванню ведаў для магчымасцей далейшага вывучэння краю. Пры інтэнсіўным будаўніцтве сацыялістычнай гаспадаркі Інстытут беларускай культуры (далей – Інбелкульт), як вышэйшая навуковая ўстанова ў Беларусі, пачаў шырока разгортваць сваю даследчую працу і ўцягваць у яе лепшыя навуковы сілы. Таму, нягледзячы на тое, што ўтварэнне краязнаўчых арганізацый у БССР пачалося на некалькі год пазней, чым у астатніх рэспубліках, краязнаўчы рух вельмі хутка пачаў набіраць усё больш прыхільнікаў. Навуковае вывучэнне Беларусі і ў далейшым ужыванне назапашаных ведаў у турыстычнай галіне стала магчымым дзякуючы актыўнай дзейнасці Цэнтральнага бюро Краязнаўства (далей – ЦБК) пры Інбелкульце.

**Асноўная частка.** У канцы 1923 г., пасля напісання падручнікаў для школ і зацвярджэння тэрміналогіі для школьных прадметаў, было створана ЦБК пры Інбелкульце. Першапачаткова ЦБК і іншымі краязнаўчымі арганізацыямі ажыццяўлялася справа назапашвання і сістэматызацыі ведаў аб Беларусі, вялася праца па вывучэнні яе культуры, гісторыі, геаграфіі, біялогіі, праводзіліся метэаралагічныя назіранні і інш.

Паралельна са станаўленнем краязнаўчай дзейнасці, надзялялася ўвагай далейшай ахове помнікаў. Для выканання гэтай задачы была прынята Пастанова СНК БССР ад 24.12.1923 г. "Аб рэгістрацыі, прыёме на ўлік і ахове помнікаў мастацтва, даўніны, быту і мясцовай прыроды, якія знаходзяцца ва ўладанні ўстаноў і таварыстваў, а таксама ў прыватных асоб". Гэтая пастанова стала першым агульнарэспубліканскім дакументам па ахове помнікаў. Дзяржаўнай ахове падлягалі *"усе старыя курганы, гарадзішчы, старадаўнія могільнікі, развалiны замкаў, цэркваў, сяліб, рэшткі старых умацаванняў у выглядзе насыпных валоў, мураваных сцен, выкапаных равоў, маўзалеяў, камянёў з надпісамі і знакамі і т.п. аб'яўляюцца дзяржаўнай маёмасцю і забараняецца іх раскопваць і разбіраць, чым бы гэта патрэба ні выклікалася"* [2]. Дзяржаўныя помнікі пазней сталі турыстычнымі аб'ектамі.

Справа развіцця краязнаўства ў БССР напачатку развівалася досыць хаатычна. Таму неабходнай стала ўніфікацыя дзейнасці розных краязнаўчых таварыстваў, гурткоў і інш., а разам з тым вызначэнне агульнага кірунку развіцця краязнаўчай працы. У сакавіку 1924 г. ЦБК правяло Мінскую краязнаўчую канферэнцыю, на якой былі абмеркаваны спосабы пашырэння краязнаўчых ідэй і ўцягнення ў краязнаўчую працу шырокіх колаў працоўных [3, с. 85]. 29 лістапада 1924 г. справа абазначэння перспектыў і метадаў каардынацыі краязнаўчай працы ў БССР была працягнута на Усебеларускай краязнаўчай канферэнцыі, дзе былі разгледжаны і ўзгоднены дадзеныя пытанні. Адразу ж пачала абазначацца структура краязнаўчых таварыстваў па раёнах, вылучыліся Віцебскае, Магілёўскае, Аршанскае, Горацкае, Калінінскае (Клімавіцкае), Барысаўскае, Мазырскае, Бабруйскае, Полацкае, Менскае і Слуцкае акруговыя таварыствы краязнаўства.

Перад ЦБК стаяла задача каардынавання дзвюх асноўных краязнаўчых плынь: дзяржаўнага навуковага і грамадскага аматарскага руху. Для таго, каб праца акруговых таварыстваў праводзілася якасна і ўніфікавана, а таксама для заахвочвання новых удзельнікаў, з 1925 г. пачалося выдавецтва штомесячніка «Наш край» ад ЦБК пры Інбелкульце. Адна з задач яго выдання была ў тым, каб краязнаўчыя даследаванi хутка станавіліся вядомымі арганізацыям і асобам, якія ўжо вывучалі родны край і тым, хто толькі пачынаў цікавіцца даследаваннямі Беларусі. Гэты

часопіс заклаў моцны падмурак для далейшага развіцця турыстычна-экскурсійнай дзейнасці ў БССР. Пачатак выдання часопіса «Наш край» супаў па часе з падрыхтоўкай пастановы СНК БССР ад 5 ліпеня 1926 г., згодна з якой на ўлік быў ўзяты 191 аб'ект архітэктуры, побыту, мастацтва, прыроды. Быў зацверджаны першы спіс помнікаў, які складаўся з 87 пазіцый. Абавязкі па іх ахове СНК ускладу на акруговыя, гарадскія і раённыя саветы [4].

Першы нумар часопіса «Наш край» выйшаў 1 кастрычніка 1925 г., і ў ім адразу ж была пастаўлена мэта – праз краязнаўства вывучыць Беларусь з усіх бакоў. Чытачоў заклікалі да напісання краязнаўчых артыкулаў, якія датычыліся ўсіх 15 адзелаў ЦБК. Падкрэслівалася, што Беларусь павінна *"пазнаць сама сябе"* [5, с. 3]. Асобная роля ў вывучэнні края надавалася настаўнікам, якіх заахвочвалі быць не толькі *"пасыўнымі даследчыкамі і наглядальнікамі мясцовага жыцця"* [5, с. 13], але і тлумачылі, што цягам вывучэння краязнаўства можна паўплываць на далейшае жыццё, прынесці ў яго новыя погляды, звычаі і веды. Шмат увагі надавалася распрацоўцы форм і метадаў арганізацыі краязнаўчай работы [6, с. 148] для яе ўніфікацыі. Для выканання гэтай задачы ў часопісе даваліся тэмы і інструкцыі па правядзенні даследаванняў, падрабязныя пералікі пытанняў па кожнай тэме. З гэтых даных можна зрабіць высновы: па якіх напрамках планавалася весці паглыбленыя даследаванні. Мікола Шчакаціхін у інструкцыі "Спосабы зьбіраньня матар'ялаў зь беларускага мастацтва падкрэсліваў": *"трэба апісваць усе старажытныя помнікі данага раёну, не пакладаючыся пры гэтым на свой асабісты густ пры выбары гэтых помнікаў, бо лепей іншы раз апісаць які-небудзь помнік мала цікаўны і мала каштоўны, як прапусьціць штонебудзь запраўды каштоўнае, што відаць толькі спэцыялістам…"* [7, с. 66].

У 1920-я гг. краязнаўчыя арганізацыі БССР толькі распачыналі сваю працу і, нягледзячы на цэнтралізаванасць і кіраўніцтва "зверху", ЦБК было зацікаўлена ў далучэнні ініцыятыўных людзей. Тым больш, што прафесійных навуковых кадраў не хапала. Таму друкавацца ў часопісе мог амаль любы чалавек, які правёў краязнаўчае даследаванне, зладзіў экскурсію і прысвяціў гэтаму артыкул. У планах працы мясцовых таварыстваў краязнаўства, якія рассылаліся па раёнах, адзначаліся наступныя раздзелы: 1) праца арганізацыйна-папулярызацыйная, 2) праца метадычная, 3) праца збіральніцка-даследчая. Пры гэтым адзначалася, што, хаця і апошні раздзел самы каштоўны, але *"з-за няпоўнага афармлення нашага краязнаўчага руху і слабай падрыхтаванасці нашага масавага краязнаўца, трэба адвесці значнае месца першым двум"* [8, с. 25].

Часопіс «Наш край» на сваіх старонках адлюстроўваў усе накірункі тагачаснага краязнаўства. Нягледзячы на тое, што часопіс называўся штомесячнікам, за 1925 г. было выдадзена толькі 2 нумары, за 1926 – 7, за 1927 – 10, 1928 –10, 1929 – 10, 1930 –7. Бачна, што колькасці матэрыяла не хапала для выдавецтва часопіса кожны месяц, але адначасова з гэтым у радзеле «Хроніка» рэгулярна асвятляліся працы сектараў ЦБК. Там жа можна заўважыць неаднароднасць структур акруговых краязнаўчых арганізацый, у якіх адрозніваліся і назвы, і колькасць секцый, і тое, што дзейнасць не супадала з пастаўленымі задачамі [9, с. 156]. Таксама заўважаецца невялікая колькасць прафесійных даследчыкаў, якія дасылалі свае справаздачы і артыкулы рэгулярна. Пераважную большасць аўтараў складалі настаўнікі.

У першым нумары часопіса ўжываецца слова "экскурсія". Бачна, што першапачаткова яно мела значэнне краязнаўчай вандроўкі для назапашвання ведаў, у той час як сёння пад экскурсіяй маецца на ўвазе "калектыўнае наведванне музея, славутых месцаў, выставы, прадпрыемства і г.д.; паездка, шпацыр з адукацыйнай, навуковай, спартыўнай або забаўляльнае мэтай" [10, с. 24]. У раздзеле "Хроніка" абазначана, што з 9 па 20 ліпеня 1925 г. была праведзена пешая экскурсія з Менску ў Магілёў [5, с. 65]. Кіраўніком магілёўскіх экскурсій быў загадчык Магілёўскага музею Зміцер Даўгяла, які ў верасні 1925 г. стаў навуковым сакратаром Гісторыка-археалагічнай камісіі Інбелкульта і заняўся вывучэннем менскага Старога горада і яго помнікаў. Гэтай працы ў 1928 г. былі прысвечаны артыкулы «Стары Менск» у №№ 1–3. З дапамогай распрацоўкі экскурсій ЦБК, супрацоўнікі Беларускага дзяржаўнага музею і дому Рабпросу ў Менску папулярызавалі помнікі гарадской архітэктуры. Падчас экскурсіі запісваліся песні, прыказкі, апавяданні, аглядаліся помнікі старасветчыны, занатоўваўся быт сялян і збіраўся матэрыял для беларускага геаграфічнага слоўніка. Настаўнікам прапаноўвалася хадзіць са сваімі вучнямі на краязнаўчыя экскурсіі, а далей трымаць цесную сувязь з мясцовымі краязнаўчымі арганізацыямі і перадаваць ім вынікі даследаваных матэрыялаў.

Дадзеныя інструкцыі цалкам паўтараюць агучаныя раней ў снежні 1921 г. на Маскоўскай Усесаюзнай краязнаўчай канферэнцыі, дзе таксама падкрэслівалася неабходнасць навуковага вывучэння края мясцовымі сіламі. Такім чынам абазначался цесная сувязь настаўнікаў з мясцовымі і цэнтральнымі краязнаўчымі арганізацыямі. Настаўнікі павінны былі стаць *"карэспандэнтамі навукова-краязнаўчых арганізацый"* [5, с. 17], якія ў сваю чаргу павінны былі забяспечыць іх неабходным метадычным матэрыялам. Так, летам 1925 г. ЦБК правяло гутаркі аб краязнаўчай працы з настаўнікамі Гомельшчыны, Смаленшчыны на курсах перападрыхтоўкі, а таксама на курсах настаўнікаў чыгуначных школ [5, с.66]. У 1926 г. у Бабруйскай акрузе пастанавілі *"залажыць лектарска-экскурсійнае бюро, якому даручыць організацыю экскурсій (экскурсіі робяць збор колекцый для музэю)"* [11, с. 71].

Ужо з першых нумароў часопіса ставіліся пытанні перспектывы вывучэння роднага краю ў будучым, што рабіць далей з назапашанымі ведамі. Плаванаалася далейшае асэнсаванне, прывядзенне ў структуру даных, сабраных на экскурсіях і ў экспедыцыйных паездках. З пункту гледжання культуры памяці, такія веды павінны былі наблізіць беларусаў да "з'яўлення сапраўднай гісторыі нашых мест і мястэчкаў" [12, с. 9–10]. Накопленыя веды ў далейшым актыўна выкарыстоўваліся ў складанні турыстычных маршрутаў. Так, дзякуючы дзейнасці аматараў краязнаўства да нас дайшлі падрабязныя апісанні і здымкі Койданаўскага і Рагачоўскага замкаў, якія не захаваліся на сённяшні дзень, але былі занатаваны ў артыкулах М. Адзярыхі "Апісаньне Койданаўскага замку" і М. Шчакаціхіна "Замак у Рагачове" [5, с. 37–40].

З цягам часу выпрацоўваліся дакладныя экскурсійныя маршруты, якія прапаноўвалася паўтараць ці рабіць свае на аснове дадзеных прыкладаў. У нумары 19 за красавік 1927 г. артыкул “Прыродазнаўчая экскурсія па Смалявіцкім раёне Менскай акругі (маршрут, методыка)” упершыню даваліся канкрэтныя пакрокавыя рэкамендацыі па правядзенні экскурсіі. Экскурсія разлічвалася на 4 дні. Быў прапісаны пэўны маршрут (Смалявічы – хутар Калюга – Бабі лес – Возера Вялікае – Юраўскае возера – Юрава – Смалявічы), пазначаны канкрэтныя моманты, на якія варта звярнуць увагу, якія ўзоры (раслін, торфу і інш) трэба ўзяць, месцы для таго, каб пераначыць. Напрыканцы артыкула пазначалася літаратура па тэме, у т.л. па экскурсіях у межах Смалявіцкага раёну, і кнігі па біялогіі. У наступным нумары В. Самцэвіч прапаноўваў свой маршрут “Культурна-гістарычная экскурсія Барысаў – Стара-Барысаў – Студзёнка”.

Таксама ў якасці дапамогі да вывучэння роднага краю і правядзення экскурсій пачынаючы з другога нумара часопіса “Наш край” быў вылучаны асобны раздзел “Бібліяграфія” са спісам карыснай літаратуры, у тым ліку і той, што тычылася экскурсій [13, с. 50]. Акрамя беларускіх і рускіх выданняў, у пераліку літаратуры таксама прысутнічалі ўкраінскія і польскія кнігі.

Цікавасць да вывучэння краязнаўства мела хвалепадобны характар, таму можна прасачыць, як для пашырэння колькасці прыхільнікаў вывучэння краю, перыядычна праводзіліся розныя заклікі. Так, у Менску па радыё чыталіся лекцыі па краязнаўстве, а ў № 11–12 зноў шукалася падтрымка ў настаўнікаў, і часопіс быў пачаты з закліку да іх. У 1926 г. быў абвешчаны пачатак збору матэрыялаў па гісторыі краязнаўчага руху ў Беларусі, заклік да гэтага друкаваўся ў нумары 13–14.

Нягледзячы на тое, што першапачаткова дзейнасць кожнага з 15 адзелаў Інбелкульта знаходзіла свой адбітак на старонках часопісу “Наш край”, аналіз зместу артыкулаў за ўсе гады існавання паказаў, што з 1926 г. у нумарах часопіса назіраецца дамінаванне прыродазнаўчых артыкулаў і змяншэнне гістарычных. Змянялася кан’юнктура і гэта не магло не адлюстравацца на дзейнасці краязнаўчых арганізацый. У апошнім нумары часопіса за 1926 г. у артыкуле Васіля Самцэвіча “Краязнаўства ў гаспадарчым і культурным будаўніцтве краю” вызначаўся далейшы накірунак краязнаўчай працы ў БССР агулам. Аўтар выступаў з крытыкай краязнаўчага руху, адзначаў, што раней ён не насіў практычна-карысны характар і цяпер *“справа краязнаўства зьяўляецца пераважна вытворчай праблемай, праблемай будаўніцтва новай гаспадаркі і новай культуры”* [14, с. 3]. Так, адбылася пераарыентацыя на прыярытэтнае вывучэнне прыродных багаццяў і асаблівасцей тэрыторыі, праблем сельскай гаспадаркі, развіцця мясцовай прамысловасці, у гэты ж час, як вывучэнне гісторыі мясцовасцей і ахова помнікаў не прызнаваліся грамадска-карыснымі. У далейшым, менавіта гэтыя напрамкі і разглядаліся ў першую чаргу пры фарміраванні турыстычных маршрутаў.

Пабачыць як новыя тэндэнцыі адбіліся на краязнаўстве можна на прыкладзе Мінска. Так, замест ранейшых даследаванняў Замчышча і Старога горада, адбылася пераарыентацыя на апісанне прадпрыемстваў. Пра гэта сведчыць пералік абследаваных аб’ектаў Менскім Акруговым таварыствам краязнаўства для выдання зборніку “Меншчына”, прадстаўлены ў № 5 за 1927 г. Так, у горадзе было абследавана “*17 прадпрыемстваў, (заводы, фабрыкі) тры скураных заводы і ФЗУ (фабрычна-завадская вучнёўская школа)...”* [15]. Падчас справаздачы аб музейнай працы 12 траўня 1927 г. была ўхвалена неабходнасць *“даабсьледаваць у такім-жа парадку і рэштку больш буйных прадпрыемстваў, сконцэнтраваўшы матар’ял аб прамысловасці гор. Менску, далучыць асьветныя, культурна-асьветныя, с.-гаспадарчыя, адміністрацыйныя і тэхнічныя ўстановы і выдаць «Экскурсійны парадак па гор. Менску» (у дапамогу раённаму і гор. экскурсанту)”* [15].

На 10-годдзе Кастрычніцкай рэвалюцыі была канчаткова зафіксавана арыентацыя краязнаўства на вывучэнне рэвалюцыйнага руху. Можна адзначыць, што папярэдняя праца па пашырэнні краязнаўства ў Беларусі мела свой плён. Разам з гэтым, у дзясятым нумары за кастрычнік 1927 г. падсумоўваліся вынікі дзесяцігадовай краязнаўчай працы. Агульная колькасць краязнаўчых арганізацый у БССР на кастрычнік 1927 г. складала 240, якія *“ахапляюць 9389 членаў, з якіх асьветнікаў каля 70%, рабочых і сялян каля 5%, вучняў каля 23% і іншых каля 2%”* [16]. Нягледзячы на вялікую колькасць гістарычных, этнаграфічных, біялагічных і інш. артыкулаў, надрукаваных у нумарах, падкрэслівалася ідэя *“краязнаўства і сучаснасці”* [16]. У снежаньскім нумары 1927 г. ЦБК абвясціла пашырэнне тэмы часопіса. Так, карэспандэнтам і ўсім зацікаўленым прапаноўвалася асвятляць жыццё беларусаў па-за межамі краіны, нацменшасцей на тэрыторыі БССР (яўрэяў, палякаў, латышоў, літоўцаў, татар, рускіх і інш.). Таксама ЦБК заклікала даследаваць помнікі архітэктуры. Адзначался, што трэба пашыраць тэмы эканомікі, прыроды *“ва ўсіх яе з’явах і формах”* гісторыі краю і раёнаў [17, с. 5].

Акцэнт на вывучэнне і фарміраванне прамысловых турыстычных маршрутаў працягваўся. У № 3 за сакавік 1928 г. у артыкуле “Краязнаўчыя экскурсіі ў выхаваньні моладзі” галоўны акцэнт быў зроблены на прамысловыя экскурсіі, наведванне прадпрыемстваў. Менавіта праз іх прапаноўвалася папулярызаваць ідэі індустрыялізацыі, прапагандаваць тэхнічныя веды; экскурсіі выступалі як сродак працоўнага і ідэалагічнага выхавання. Менавіта такія экскурсіі рэкамендавалася распрацоўваць і праводзіць у першую чаргу. Яны ж у 1930-я гг. сталі асноўным кірункам турыстычнай працы.

У 1928–1929 гг. на старонках часопіса перыядычна з’яўляліся артыкулы пра экскурсіі, экскурсійныя аб’екты і маршруты, але можна адзначыць значную перавагу тэм рэвалюцыйнага руху, вывучэння саўгасаў і прадпрыемстваў. Нягледзячы на гэта, праца часопіса не супадала з ідэямі і задачамі сацыялістычнага будаўніцтва. У кастрычніку 1930 г. часопіс “Наш край” быў перайменаваны ў “Савецкая краіна”, у першым нумары якога

наўпрост абвінавачваліся былыя кіраўнікі БАН[1], а “Наш край” называўся рупарам контрэвалюцыйнага беларускага нацыянал-дэмакратызму [18, с. 210].

Згодна з афіцыйным курсам, “*у пачатку 1930-х гг. краязнаўства ў БССР фактычна вынішчана, многія вдомыя вучоныя і мясцовыя краязнаўцы рэпрэсіраваны. У 1932 г. прынята пастанова СНК БССР «Аб мерапрыемствах па разгортваньню краязнаўчага руху», якая прадпісвала краязнаўцам дасьледаваць і паказваць выключна посьпехі сацыялістычнага будаўніцтва”* [19, с. 259].

**Заключэнне.** Станаўленне турыстычнай дзейнасці ў БССР пачыналася з развіцця краязнаўства, якое ў БССР кіравалася ЦБК пры Інбелкульце. У 1920-я гг. ішло назапашванне ведаў па краязнаўстве з мэтай далейшай іх сістэматызацыі і больш глыбокага ўсебаковага даследавання Беларусі з пункту гледжання яе гістарычных адметнасцей. Галоўным сродкам сувязі кіраўніцтва ЦБК з аматарамі краязнаўства на месцах з’яўляўся часопіс “Наш край”, які адлюстроўваў галоўныя тэндэнцыі і дасягненні ў вывучэнні краязнаўства на той момант. Дзякуючы штомесячніку, краязнаўчыя таварыствы і гурткі працавалі па ўніфікаваных праграмах і методыцы і такім чынам прымалі актыўны ўдзел у рабоце секцый Інбелкульта. Тэарэтычныя падмуркі краязнаўчых даследаванняў, сфармуляваныя на старонках часопіса “Наш край”, а таксама арганізаваныя ЦБК экспедыцыі, зрабілі магчымым вывучэнне розных раёнаў БССР. На старонках часопіса абмяркоўваліся задачы і напрамкі краязнаўчай дзейнасці, прынятыя на з’ездах і канферэнцыях. З 1926 г. ў краязнаўстве Беларусі назіраецца тэндэнцыя да ўсё большай арыентацыі на праблематыку вывучэння гісторыі рэвалюцыйнага руху. Экскурсіі і экспедыцыі галоўнай мэтай ставілі не знаходкі і вывучэнне помнікаў архітэктуры і іх апісанне, а надавалі больш увагі даследаванням прыродазнаўства, вывучэнню сялянскай гаспадаркі і развіццю прадпрыемстваў. Нягледзячы на ўсе меры па захаванню вывучэння мясцовых асаблівасцей, з 1930 г. пачала праводзіцца канчатковая пераарыентацыя краязнаўства Беларусі на агульнасавецкія “практычна-карысныя” тэмы. Тым не менш, за непрацяглы перыяд свайго існавання, ЦБК і часопіс з красамоўнай назвай “Наш край” аказалі вялікі ўплыў на станаўленне экскурсійна-турыстычнай дзейнасці ў БССР. У межах набіраючага моц краязнаўчага руху дзейнасць гэтых структур надала імпульс усебаковаму вывучэнню Беларусі, у тым ліку і праз формы экскурсійнай дзейнасці. Вынікі краязнаўчай працы ў далейшым браліся ў разлік пры стварэнні паўнавартасных турыстычных маршрутаў.

## ЛІТАРАТУРА


1. Национальный правовой Интернет-портал Республики Беларусь [Электронный ресурс]. – URL: http://www.pravo.by/document/?guid=12551&p0=H12100129&p1=1&p5=0 . (Дата обращения: 27.01.2022).
2. НАРБ. – Ф. 42, Воп. 1, Спр. 535, Арк. 89.
3. Інстытут Беларускае Культуры (Інбелкульт): гісторыя ўзьнікненьня, сучасная структура, навукова-дасьледчая дзейнасьць / Ін-т Беларус. Культуры; апрац. навук. сакратар Інбелкульту А.І. Цьвікевіч. – Менск: ДВБ, 1926. – 114 с.
4. Бюллетень Совета Народных Комиссаров Б.С.С.Р. – 1926. – № 9 (18). – С. 24–28.
5. Наш край. – 1925. – № 1. – 68 с.
6. Соркіна І.В. Дзейнасць Цэнтральнага Бюро Краязнаўства па вывучэнні мястэчак Беларусі: па матэрыялах часопіса “Наш Край” (1925-1930 гг.) // Институт Белорусской культуры и становление науки в Беларуси. К 90-летию создания Института Белорусской культуры: материалы Междунар. науч. конф., Минск, 8-9 дек. 2011 г. / Нац. Акад. наук Беларуси; ред. Н.В. Яковенко. – Минск, 2011. – 770 с.
7. Шчакаціхін М. Спосабы зьбіраньня матар’ялаў зь беларускага мастацтва // Наш край. – 1926. – № 2-3. – С. 66.
8. Краязнаўства зборнік праграм і інструкцый краязнаўчай працы / Беларуская акадэмія навук. – Менск: друк. БАН, 1929. – Вып. 1. – С. 113.
9. Лютыч К.М. Інбелкульт і краязнаўчы рух (Паводле раздзелу “Хроніка” часопіса “Наш край”) / Институт Белорусской культуры и становление науки в Беларуси. К 90-летию создания Института Белорусской культуры: материалы Междунар. науч. конф., Минск, 8-9 дек. 2011 г. / Нац. Акад. наук Беларуси; ред. Н.В. Яковенко. – Минск, 2011. – С. 156.
10. Ганскі У.А., Ваўнейка К.В. Экскурсазнаўства. – Наваполацк: ПДУ, 2012. – 254 с.
11. Краязнаўчая праца ў Бабруйскай акрузе // Наш край. – 1926 – № 6-7 (9-10). – С. 71.
12. Дружыч В. Краязнаўства ў гістарычнай галіне // Наш край. – 1927 – № 12 (15). – С. 9–10.
13. Бібліографія // Наш край. – 1925. – № 2. – С. 50.
14. Самцэвіч В. Краязнаўства ў гаспадарчым і культурным будаўніцтве краю // Наш край. – 1926. – № 12. – С. 3.
15. Хроніка // Наш край. – 1927. – № 6. – С. 64.
16. Казак А. Краязнаўства ў БССР к дзесяцігодзьдзю Кастрынікавай Рэволюцыі // Наш край. – 1927 – №10. – С. 10.
17. Пашырэньне тэматыкі “Нашага Краю” // Наш край. –1927. – № 12. – С. 5.
18. Аляксееў Л.В. Разгром краязнаўства // Памяць: Мінск. Гісторыка-дакументальная хроніка гарадоў і раёнаў Беларусі. – Т. 3. – Мінск, 2004. – 736 с.
19. Трэпет Л. Краязнаўства // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. – Т. 4. – С. 257–260.


*Пастуліў 23.09.2022*

[1] Інбелкульт у 1928 г. быў рэарганізаваны ў Беларускую акадэмію навук (БАН) і ЦБК увайшло ў структуру арганізацыі.

## СТАНОВЛЕНИЕ ЭКСКУРСИОННО-ТУРИСТИЧЕСКОЙ ДЕЯТЕЛЬНОСТИ В 1920-е гг. В СВЕТЕ КРАЕВЕДЧЕСКИХ ИНИЦИАТИВ

***С.М. ГРИШКЕВИЧ***
***(Институт истории Академии наук Беларуси, Минск)***

*В данной статье рассматриваются краеведческие инициативы Института белорусской культуры в контексте их дальнейшего влияния на развитие туристическо-экскурсионной деятельности. В 1920-е гг. шёл процесс сбора и систематизации краеведческих знаний. Становление туристической деятельности в БССР начиналось с развития краеведения, которое в БССР управлялось ЦБК при Инбелкульте. Главным средством связи между руководством ЦБК с любителями краеведения на местах являлся журнал "Наш край", который отражал главные тенденции и достижения в изучении краеведения на тот момент. Первоначально особое внимание уделялось изучению и сохранения архитектурного и исторического наследия, однако уже с 1926 г. наблюдалась переориентация краеведения на "социально-полезные" темы. На фундаменте собранных краеведами знаний в дальнейшем строились экскурсионные маршруты.*

***Ключевые слова:*** *Инбелкульт; краеведение; туризм; Наш край; БССР; Центральное Бюро Краеведения; охрана памятников*

## THE FORMATION OF SIGHTSEEING AND TOURISM IN THE 1920s. THROUGH INITIATIVES OF LOCAL HISTORY OF INBELCULT

***S. HRYSCHKEVICH***
***(The Institute of History of the Academy of Sciences of Belarus, Minsk)***

*In this article author says about the formation and developement of local history in BSSR in 1920s.. The study of local history was very important to the process of collecting and systematizing local knowledge for future touristic routes. The formation of tourism activity in the BSSR began with the development of local history, which in the BSSR was managed by the CBK under Inbelkult. The main means of communication between the management of the CBK and local history lovers was the magazine "Nash Kraj", which reflected the main trends and achievements in the study of local history at that time. Initially, special attention was paid to the study and preservation of architectural and historical heritage, but since 1926 a reorientation of local studies on "socially useful" topics were observed. Excursion routes were subsequently built on the basis of the knowledge collected by local historians.*

***Keywords:*** *Inbelcult; local history; tourism; Magasine "Nash Kraj", BSSR, Central Buro of local history, hiding monuments.*